Цана асобнага нумару 20 гр.

Opłatę pocztową uiszczono ryczałtem.

ВОЛЯ ПРАЦЫ

Выходзіць два разы у тыдзень.

Адрэс Рэдакцыі і Адміністрацыі: Вільня, Віленская вул. 12—6 (Wileńska 12. m. 6) Рэдакцыя адчынена ад 12 да 2 гадз. штодня, апрача сьвяточных дзён. Адміністр. ад 9 да 3.	Падпіска на адзін месяц з дастаўкай да хаты 1 зл. 50 гр. Для заграніцы ўдвая даражэй. Перамена адрэсу 30 гр.	Няпрынятыя ў друк рукапісы назад не вяртаюцца. Аплата надрукаван. залежыць ад Рэдакцыі.	Цана абвестак: перад тэкстам 25 грош., сярод тэксту 20 грошы і на 4 стр. 15 грош. за радок пэтыту ў 1 шпальту.

№ 6 — Вільня, Субота 31-га сакавіка 1928 г. — Год 1

Нясмачная дэманстрацыя...

Ан'яненьне пасьпехам адзінкі пры выбарах у Сойм і Сэнат, аб якім так крычалі яшчэ нядаўна ўсе прыхільнікі яе, раптам разсеілася... і навет перайшло ў пэсымістычныя настроі, што да значэньня адзінкі ў Сойме. Першы дзень новага Сойму спрычыніўся да такой радыкальнай зьмены настрояў прыхільнікаў адзінкі.

Адзінка думала, што такі самы пасьпех спаткае яе і ў Сойме як і пры выбарах і была пэўна ў тым, што займе першараднае месца ў працы новага Сойму. Але пасьпех у самым Сойме ўсё-ж ня мог быць забясьпечаны тымі мерамі, якімі кіравалася адзінка пры выбарах. Найбольшая мера і найбольш магчымая для адзінкі—гэта роспуск новага Сойму, але, відаць, урад, за якім стаіць адзінка з 135 пасламі ў Сойме, ня выкарыстае гэтае магчымасьці навет пасьля выпадкаў на першым паседжаньні Сойму. А выпадкі гэтыя вельмі важныя, яны зусім пакрыжавалі пляны ўраду, бо паказалі, што, ня гледзячы на каля 140 паслоў прыхільнікаў адзінкі — ўсё-ж паслом гэтым можа няўдасца быць „orężem" ураду ў Сойме, у чым яшчэ нядаўна быў так упэўнены ўрад.

Дзьве рэчы паказаў на сваім паседжаньні новы Сойм: першая, *што ён ня будзе такім ласкавым і паслухмяным, як цялё, і ня дрыжыць перад моцным урадам марш. Пілсудскага* — другая, што, *ня гледзячы на трацiну паслоў з адзінкі, урад ня зможа павясьці сваей лініі ў Сойме без падтрыманьня іншых партыяў.* Першая выявілася з самага пачатку паседжаньня, калі камуністычныя і ўкраінскія паслы выступілі з клікам „Прэч фашыстаўскі ўрад марш. Пілсудскага!", а ў зьвязку з-гэтым узьнікла авантура і ўрэшце выдаленьне паслоў пры помачы паліцэйскіх мераў; другая, калі на маршалка Сойму быў выбраны пэпээсавец пас. Дашыньскі, у процівагу кандыдату з адзінкі сябру ўраду Пілсудскага Казіміру Бартлю. За пас. Дашыньскага пала 206 галасоў, за п. Бартля толькі 142. І гэта тады, калі хадэкі і эндэкі, украінцы і камуністы аддавалі свае галасы за сваіх кандыдатаў! Такім чынам толькі розныя сацыялісты з часткай меншасьцяў правялі пас. Дашыньскага. Гэта няўдача адзінкі змусіла яе ацьверазіцца і пашукаць выхаду з непрыемнай сытуацыі. Дзе-ж выхад з гэтай сытуацыі? Пакуль што яго ня відаць. Пасьля выпадкаў на першым паседжаньні Сойму, якія прыхільнікі адзінкі назвалі „нясмачнай дэманстрацыяй", ува ўсіх амаль палітычных колах Польшчы кружылі настроі, што Сойм будзе распушчаны. Першыя забілі трывогу і пачалі выяўляць дамаганьні аб роспуску Сойму абшарнікі-манархісты, што ўваходзяць у склад адзінкі. Пасьля „нясмачнай дэманстрацыі" Клюб адзінкі доўга нараджваўся—хоць яшчэ і ня ведама, да чаго прыняла гэта нарада. На другі дзень трывожны настрой крыху ўлёгся і аб роспуску Сойму ўжо менш гутарылі. Але зусім трывога ня зьнікла, пашлі ў ход розныя разважаньні і прадпалажэньні. Навет манархісты крыху супакоіліся, хоць і надалей цьвердзяць, што Сойм трэба распусьціць. „Дэмакраты"-ж з „Kurjeru Wileńsk'ага" выказваюць сваё пераконаньне ў тым, што выпадкі на першым паседжаньні былі толькі „нясмачнай дэманстрацыяй", зробленай супольнымі сіламі ўсіх партыяў супроць адзінкі, што большасьць, якую атрымаў пас. Дашыньскі, зьяўляецца выпадковай, што Сойм без адзінкі, дзякуючы сваей раздробленасьці, нічога зрабіць ня зможа, а таму яшчэ паглядзім, чыя возьме. На такое разважаньне „Kurjer'a Wileńsk'ага, відаць, шмат уплынула прамова і тактыка новаабранага маршалка Сойму Дашыньскага, аб якім навет „K. W." гаворыць з вялікай пашанай. Газэты так сама прыносяць весткі, што новы маршалак Сойму доўга канфэраваў з марш. Пілсудскім, пасьля чаго і настрой паспакайнеў. Дык мо' насьпявае паразуменьне між пілсудчыкамі і P. P. S.? Не дарма-ж манархісты ўсё б'юць трывогу і крычаць аб патрэбе роспуску Сойму. Як ведама, пасьля адзінкі P. P. S. зьяўляецца самай большай партыяй, хоць разам з адзінкай і P. P. S. абсалютнай большасьці ня створаць.

Дык можа і „Вызваленьне" туды-ж? А што-ж і гэта можа быць не навіной для „польскіх сацыялістаў", асабліва для P. P. S., якая, як ведама, здаўна ўжо сымпатызавала Пілсудскаму, ня раз ішла на ўгоду з рознымі буржуазнымі групіроўкамі і прадавала інтарэсы працоўных масаў. Дык і цяпер можа пайсьці па тым-жа шляху.

Што-ж датычыць адзінкі, дык яна пэўне-ж ня ўступіць сваей першараднасьці, якую так цяжка здабыла сабе пры выбарах. Дык або паразумеецца з іншымі большымі партыямі, або новы Сойм пахавае. „Нясмачная дэманстрацыя", якая нарабіла столькі клопату ўраду марш. Пілсудскага, змушае адзінку хутчэй знайсьці якісь „пэўнейшы" шлях, а ня марыць аб сваей першараднасьці.

А гэты „пэўнейшы" шлях або паразуменьне, „коаліцыя" з іншымі партыямі, або „моцная" ўлада бяз Сойму.

Скіф.

Праекты агульнага разбраеньня Радавага дэлегата Літвінава на Канфэрэнцыі у Жэнэве.

Ад 15 па 25 сакавіка адбывалася ў Жэнэве Падрыхтаваўчая Канфэрэнцыя ў справе разбраеньня. „Гвазьдзём" Канфэрэнцыі зьявілася прамова Радавага дэлегата Літвінава, які бараніў праект агульнага разбраеньня, апрацаваны радавым урадам. У сваёй прамове Літвінаў даказваў, што Радавы праект агульнага разбраеньня ня мае падобных да сябе фактаў у-ва ўсей гісторыі чалавецтва. Праект, калі б быў зьдзейсьнены, разам вырашыў-бы шмат балючых справаў нашага часу. Вырашана была-б справа агульнай бясьпечнасьці, разьвязана пытаньне аб вольнасьці мораў і г. д.". Гэты праект, казаў аратар, быў-бы з захопленьнем спатканы шырокімі масамі працоўнага народу ў-ва ўсім сьвеце, а такасама ўсімі найшляхотнейшымі прадстаўнікамі інтэлігенцыі ўсяго чалавецтва. Дык цяпер рашучае слова—у справе яго зьдзейсьненьня—належыць да ўрадаў і тых буржуазных клясаў, на якія гэтыя ўрады апіраюцца". Аратар і зьвярнуўся да гэтых прадстаўнікоў урадаў, каб яны ўзялі на сябе сьмела адказнасьць за рашэньне, а прынамсь—зрабілі першы крок на прапанаваным шляху. Літвінаў заклікаў сяброў канфэрэнцыі, якая сабралася пад фірмай Лігі Нацыяў, каб яны кінулі той шлях, якім дагэтуль ішла гэтая Ліга. — Бо-ж Ліга нічога не зрабіла дагэтуль для справы разбраеньня.

„14 арганізацыяў, існуючых пры Лізе Нацыяў, казаў ён, усяго разам зьбіраліся 120 разоў на сэсіі ды канфэрэнцыі, у часе якіх абгаварвалася справа разбраеньня. На адных толькі пленарных паседжаньнях Лігі і яе Рады было прынята 3 рэзалюцыі ў гэтай справе. Але — вось прыклад, як гэтыя рэзалюцыі ды ўмовы зьдзяйсьняюцца ў жыцьці.—Ведамая ўмова аб адмове ад хімічнай вайны (тасаваньне труцячых газаў) дагэтуль прынята толькі 3 дзяржавамі. Аднэй з гэтых дзяржаваў зьяўляецца СССР, ня гледзячы на тое, што яго ўрад ня прымаў учасьця ў апрацаваньні тэксту гэтай умовы. Ліга Нацыяў толькі топчацца на мейсцы, толькі пазбаўляючы народы веры ў магчымасьць запраўднага разбраеньня.

Вельмі вострa палямізаваў Літвінаў з англійскім урадам, закідаючы яму сталы сабатаж разбраеньня—у мэтах англійскага панаваньня на морах. У бок Амэрыкі Літвінаў сказаў, што мін. Кэллог найлепш даказаў-бы шчырасьць сваей прапазіцыі ў справе вечнага міру, калі-б далучыўся да радавага праекту, які—якраз рэалізуе шляхам агульнага і запраўднага разбраеньня фактычнае зьніштажэньне вайны назаўсёды, маральнае асуджэньне якой высунуў у сваей прапазіцыі амэрыканскі ўрад...

Літвінава падтрымалі нямецкія і турэцкія дэлегацыі.

Нямецкі дэлегат гр. Бэрнсдорф заявіў, што радавыя прапазіцыі — лягічны вывад з знамявітых „14 пунктаў" амэрыканскага прэз. Вільсона (аб вольным самаазначэньні народаў і г. д.). Турэцкі дэлегат мін. загр. спраў Тэффік-Рушлі вельмі дзякаваў радавай дэлегацыі за яе пачын у палючай справе разбраеньня.

За тое рэшта дэлегатаў — Італі, Францыі, Англіі, Японіі, Канады і інш. рэзка крытыкавалі і асуджалі радавы праект за яго не рэальнасьць, не выканальнасьць, закідаючы радаваму ўраду, што той сваім праектам толькі робіць агітацыю, хвалюючы беспадстаўна народы. Асабліва востра і ядавіта ганіў праект Радаў англійскі дэлегат лёрд Кушэндун. Паміж іншым ён пытаўся Літвінава, ці яго праект мае такасама скасаваць назаўсёды і хатнюю вайну паміж клясамі, як і паміж дзяржавамі і народамі. Востра палямізаваў англійскі дэлегат з радавым, закідаючы яму шкодную крытыку працаў Лігі Нацыяў. На наступным паседжаньні канфэрэнцыі Літвінаў даў адказ на крытыку яго праекту. Літвінаў пратэставаў проці закідаў, быццам радавы ўрад сабатуе працу Лігі Нацыяў ў напрамку разбраеньня. Наадварот — ужо з 1922 г. Чычэрын —на Жэнэўскай Канфэрэнцыі выступіў за агульнае разбраеньне. Дый ад таго часу радавы ўрад не абмінуў ані воднай магчымасьці, каб шляхам разбраеньня прысьпяшыць справу агульнага міру...

Цяпер радавы ўрад прапануе прыняць яго праект за падставу для далейшай дыскусіі, прынамсь прызнаўшы яго асноўныя прынцыпы — за супольныя для ўсіх мэты. „Цьверджаньне англійскага дэлегата, быццам радавы ўрад выклікае ўсюды ўнутраныя канфлікты ды рэвалюцыі — нічым не даказаная клевята".

Чаму ж англійскі ўрад, калі ў яго чыстае сумленьне, адмовіўся зрабіць сьледзтва ў справе так званага „лісту Зіноўева. Што ж датычыць супярэчнасьці паміж радавым праектам і статутам Лігі, дык гэта можа даводзіць, што статут Лігі трэба зрабіць больш паступовым ды датасаваным да вымаганьняў жыцьця і дабра народаў. Францускі дэлегат гр. Клезэль прапануе, каб Вялікая Міжнародавая Канфэрэнцыя ў справе разбраеньня адбылася перад верасьнёвым Агульным Зборам Лігі. А пакуль разглядзець і радавы праект, не адкідаючы яго зусім. Толькі перад тым трэба перадаць яго на разгляд паасобных урадаў, каб тыя маглі дакладна пазнаеміцца з яго зьместам. Тады разгляд праекту меў бы адбыцца на наступнай сэсіі падрыхтаваўчай канфэрэнцыі.

Бачучы згары правал такога радыкальнага праекту, Літвінаў унес 23 сакавіка другі праект, больш паволны ды паступовы, у якім прапанаваў зьменшыць безадкладна ад $1/4$ да $1/3$ усе збраеньні дзяржаваў—у залежнасьці ад варункаў, у якіх знаходзіцца кожнае з іх; новы праект пакідае ваенныя матэрыялы, за выняткам танкаў і цяжкой артылерыі.

На апошнім паседжаньні канфэрэнцыі 24 сакавіка першы праект Літвінава быў канчальна адкінуты без разгляду, а другі — аб частковым абмяжаваньні збраеньняў—пастаноўлена пераслаць урадам, як матэрыял для наступнай сэсіі канфэрэнцыі, якую пастаноўлена склікаць перад верасьнёвым Агульным Зборам Лігі. Дамаганьні нямецкай дэлегацыі аб тым, каб канфэрэнцыя зараз-жа назначыла час, калі мае быць склікана Вялікая Міжнародная Канфэрэнцыя ў справе разбраеньня,—не чакаючы канца працаў падрыхтаваўчай канфэрэнцыі, апошняя адкінула таксама —Бо-ж прадстаўнікі Бэльгіі, Італіі, Англіі, Японіі, Польшчы і Францыі ўсе выказаліся рашуча проці нямецкай прапазіцыі.

Гэткім чынам на канфэрэнцыі толькі тры дзяржавы рашуча сталі за радыкальнае разбраеньне: СССР, Нямеччына і Турцыя. Рэшце дзяржаваў гэтая справа не выдавалася залішне пільнай.

Аб адчыненьні Сойму.

Калі ў салю Сойму ўвайшоў маршалак Пілсудскі, раптоўна пачуўся крык камуністычнага пасла Сахацкага: „Няхай жыве дыктатура пралетарыяту, няхай жыве польская рэспубліка радаў". Адначасна адгукнуліся другія камуністыя: „Прэч з тэрорам, выпусьціце палітычных вязьняў". Паўстае гоман, у якім ня можа зразумець крыкаў. Маршалак Пілсудскі абаперся аб прэзыдыяльны стол і два разы паўтарыў: „Паны, будзеце выкінуты з салі", потым зьвярнуўся да стаячага пры боку міністра ўнутраных спраў, генэрала Складкоўскага. Ген. Складкоўскі вышаў, а Маршалак пачаў разглядаць салю. Настала ціша, у чаканьні чаго-та. Раптам з дзьвярэй ад боку камуністычных паслоў зьяўляецца ген. Складкоўскі, на чале аддзелу мундуровай паліцыі, азброенай ружжамі. На гэты відак паўстаў шалёны гоман абурэньня лявіцы, і брава адзінкі. Паліцыя пакіравалася ў бок камуністаў і пачала іх вывадзіць. Камуністыя запяялі інтэрнацыянал. Паліцыя вывела трох камуністых, трох украінскіх радыкалаў і па „абмылцы" аднаго вызваленца.

Пас. Вавьніцкі (Вызв.): „добры пачатак".

Пас. Выжыкоўскі (Выз.): „ганьба"!

Гоман трывае. Сацыялістыя пяюць „Чырвоны Штандар". Пацiху чуваць пяяне украінцаў: „Ще не ўмэрла Украіна".

Маршалак Пілсудскі б'е рукой аб стол. Папярэджваю паноў, што я ня буду ўрадаваць пры крыках і таму не адчыню Сойму.

Пасол Выжыкоўскі: Урадаваньне, але не з паліцыяй.

Пасол Паляковіч (№ 1) штосьь адказвае.

Маршалак Пілсудскі. Ціха там, прашу не перашкаджаць, і пачаў адчытваць адозву Прэзыдэнта Рэспублікі.

Па адчытаньні прыступаецца да выбараў Маршалка Сойму.

Паслы Багіньскі і Выжыкоўскі (Вызв.): да тымчасовага марш. Сойму Бойко. Мы тут правім, а не паліцыя. Пан заавансаваў на паліцыянта. Сорам пану на старыя гады!

Маршалак (тымчасовы) Бойка—як будзе выбраны Маршалак, то будзеце гутарыць год і шэсьць тыдняў.

Пасол Багіньскі. Дык пан прызнае, што пан ня ёсьць маршалак, а толькі паліцыянт. Потым пас. Багіньскі жадае слова ў справе тэхнікі галасаваньня і ўносіць ад імя свайго клюбу галасаваньне са сьпіску.

Пасол Жулаўскі (ППС) (да Бойко): Няхай пан запытаецца ў пана Складкоўскага.

Мар. Бойко. Не патрабую хадзіць да пана па навуку, бо пан малады. Пасьля ідзе галасаваньне на выбары маршалка Сойму.

Выбраны не кандыдат Блёку Супрац. з Урадам, пасол Бартэль, на якога галасавала толькі сама „адзінка", а Дашыньскі з ППС, (які ня гледзячы на сваю партыю, усё-ж-такі выявіў сваю ўгоду з урадам).

З гэтага бачым, што Сойм падзяліўся на 2 лягэры, на „ядынку", супрацоўніцтва з Урадам, маючую меншасьць, і на апазіцыю, маючую соймавую большасьць. Гэтак выявіў сябе Сойм у першым-жа дні свайго істнаваньня, а што далей будзе? — пачакаем — пабачым.

Палітычная хроніка.

У Польшчы.

Адчыненьне Сойму і Сэнату.

Падаем у скароце — паводле тэлегр. „ПАТ" — ход першага паседжаньня Сойму і Сэнату.

Перадусім трэба адзначыць, што адчыненьне заканадаўчых палатаў адбылося — ня ў Замку п. Прэзыдэнта, як прадбачылі газэты ды, як гэта завялося быццам ад маёвага перавароту, але ў уласнай салі Сойму. Газэты пішуць, што ў гэтым выпадку зрабіў уступку Урад. Бо быццам паслы пэпэсы і вызваленцы, ня кажучы ўжо аб іншых—лявейшых — заявілі, што — ня пойдуць у Замак... Слушна ў гэтым газэты бачаць першую „перамогу" Сойму. Але можа—за тое— і п. Прэзыдэнт ня прыехаў асабіста у парлямант, але даручыў адчыненьне яго старшыні Ураду марш. Пілсудскаму.

— — —

Паседжаньне пачалося ў палове 6-тай. Адчыніў яго, як сказана, марш. Пілсудскі.

Але, як толькі старшыня Ураду заняў месца старшыні Сойму, як з лавак камуністычных паслоў пачаліся крыкі: „Далоў Фашыстаўскі Урад Пілсудскага". На гэта з іншых лавак пачалі крычаць: „Колькі грошы далі вам за гэта з Масквы"... Марш. Пілсудскі тройчы пагразіў камуністам: „Паны будзеце выкінуты з салі". Але голас ня сьціхаў. Тады соймавая паліцыя сілай выдаліла крычаўшых паслоў-камуністаў з салі.

Марш. Пілсудскі заявіў, што ён ня будзе спаўняць абавязкі пры крыках і авантурах — дык не адчыніць Сойму.

Пасьля гэтага ён прачытаў зварот—маніфэст п. Прэзыдэнта да Сойму.

„Трэці раз ужо — пасьля здабыцьця волі — зьбіраецца Сойм Рэспублікі. Першы Сойм пачынаў працу, калі лёсы нашай дзяржавы былі вельмі няпэўныя, калі аб муры гэтага будынку біла яшчэ рэха вайны, якая вялася за нашыя граніцы.

Пры канцы другога Сойму стаяла яшчэ бледная зара міру ды цяжкая трывога аб дзяржаўным скарбе, а навакол нашага гаспадарчага жыцьця зьбіраліся ўсё чарнейшыя ды грозьнейшыя хмары. Вы-ж паны, маеце распачаць сваю працу ў варунках значна шчасьлівейшых. Агульная апінія сьвету ацаніла нашае гарачае супрацоўніцтва ў справе агульнага міру.

Апіраючыся моцна на абаронныя саюзы з Францыяй і Румыніяй, Польшча мае і надалей прадаўжаць працу ў напрамку мірнага сужыцьця народаў, асабліва там, дзе адносіны ўлажыліся найцяжэй — паміж бліжэйшымі суседзямі. Усё гэта, кажа далей прамова, забясьпечывае паслом спакойную працу — „над падняцьцем маральнай і матэрыяльнай культуры, так сільна заняпаўшай у нас—ня з нашай віны, але з віны іншых".

Канцавы кавалак прамовы п. Прэзыдэнта быў найважнейшы — бо зьмяшчаў быццам праграму працы, на якую спадзяваўся, ці падсоўваў Сойму Урад.

— —

„Жадаю паном, каб вы патрапілі выкарыстаць час для папраўленьня агульна адчуваных заганаў нашага дзяржаўнага ладу. Бяз моцы гэтага ладу мы ня будзем здольныя бароцца ні з якімі труднасьцямі. Жадаю паном, каб з найлепшай воляй, лічучыся з рэальнымі патрэбамі жыцьця, шукалі вырашэньня вялікай задачы — стварэньня гарманічнага (раўнаважнага) супрацоўніцтва дзяржаўных уладаў.

А гэта будзе зроблена — як залажэньнем новых законных падставаў у гэтай галіне (зьмена Канстытуцыі), таксама і з увядзеньнем здаровых звычаяў штодзеннага жыцьця ў працы Сойму і супрацоўніцтва яго з Урадам"(?).

У заключэньне, пажадаўшы паслом „пладатворчай працы", каб адбывалася толькі тады, калі людзі „зьвяртаюць увагу на сутнасьць рэчаў", марш. Пілсудскі — ад імя Прэзыдэнта абвесьціў Сойм адчыненым.

Праграма першага паседжаньня.

Пасьля гэтага марш. Пілсудскі абвясьціў уложаную Прэзыдэнтам праграму першага паседжаньня Сойму, якая зьмяшчала:
1) прывядзеньне паслоў да прысягі;
2) выбар старшыні Сойму.

„Паводле волі ды назначэньня Прэзыдэнта старшынстваваць на першым паседжаньні будзе пасол Бойко", заявіў марш. Пілсудскі, запрашаючы пасла. Але, трэба дадаць, што п. Бойко, як найстарэйшы векам пасол, павінен быць старшынёй першага паседжаньня—да выбару новага маршалка — паводле Канстытуцыі.

Пас. Ярэмыч робіць фармальную прапазіцыю—адрочыць паседжаньне—а прычыны таго, што шмат паслоў не маглі прыехаць. Пас. Возьніцкі (Вызваленьне) хоча ўзяць голас у справе прысягі, але старш. заяўляе, што—пакуль паслы ня прымуць прысягі, ён нікому голасу ня дасьць.

Пасьля гэтага адбываецца прысяга.

Выбар старшыні Сойму.

У выбарах прымаюць удзел 393 паслы. Першае галасаваньне дало—паслу Дашыньскаму 172 галасы, пас. Бартэлю — 136. пас. Зьвежыньскаму (эндэк) — 37, пас. Лепшыньскаму (украінец з сьпіску № 18) — 28, пас. Сыпуле (№ 13 камуніст)—13 галасоў. Устрымалася ад галасаваньня 47 паслоў.

Дзеля таго, што ані водзін з кандыдатаў не атрымаў абсалютнай большасьці, было зроблена другое галасаваньне — толькі пяцёх кандыдатаў.

У гэтым галасаваньні прымала ўчасьце ўжо 434 паслы. Устрымаліся зноў 36. Тым чынам абсалютная большасьць, даючая выбар,—200 галасоў. Пас. Дашыньскі атрымаў—206 галасоў, пас. Бартэль — 142, пас. Зьвежыньскі—37, пас. Сыпула—13.

Гэткім чынам выбраным на старшыню Сойму аказаўся пас. Дашыньскі, пасол пэпэсаў. На запытаньне старшыні Бойко ён заявіў, што выбар прымае. Калі новавыбраны старшыня займае месца маршалка, усе паслы ўрадавага блёку разам з усімі міністрамі дэманстратыўна выходзяць з салі Сойму.

Справа ў тым, што Урад і ўрадавы блёк у Сойме катэгарычна трэбавалі, каб старшынёй Сойму быў выбраны пас. і віцэпрэм'ер Бартэль. Дык і абурыліся на тое, што большасьць Сойму ня споўніла іх жаданьня.

Прамова старшыні Дашыньскага.

З прычыны ўсяго гэтага асабліва цікавай выяўляецца прамова п. Дашыньскага. Дык падаем яе зьмест—у поўным скароце.

Старш. Дашыньскі кажа, што драматычнае паседжаньне сёньня закончылася выбарам яго старшынёй. Выбар ён прымае, як асаблівую чэсьць для сябе. „Як старшыня Сойму, будзе асабліва сьцерагчы правы і годнасьць гэтай высокай палаты"... „Ведаю, што мае старшынства ня будзе правам бесклапотнага жыцьця". Новы старшыня абяцае пільнаваць—„гармонічнае супрацоўніцтва з урадам, ляяльнае супрацоўніцтва—без узаемных дражненьняў". Але і сама Высокая Палата павінна быць годнай высокай задачы направы Рэспублікі, годным прадстаўніцтвам агульнага ўсенароднага галасаваньня.

Ст. Дашыньскі падчарківае асаблівыя правы гэтага Сойму ў галіне зьмены Канстытуцыі. У заключэньне старшыня кажа, што — пры ўзаемнай ляяльнасьці Сойму і Ураду—удасца даканаць вялікай працы для дабра краю.

У канцы старшыня заяўляе, што наступнае паседжаньне — для выбару віцэ-старшыняў і сэкратароў — мае адбыцца назаўтра. Пасьля прамовы новага маршалка, некалькіх паслоў—камуністаў, вызваленцаў і ўкраінцаў пратэставалі проці выкіданьня паслоў з салі Сойму.

„Настроі ў Сойме".

Карэсп. „Дзен. Віл." падае цікаўныя весткі аб тым, як зрабілася сярод паслоў большасьць за пас. Дашыньскага ды — проці п. Бартэля.

У часе ўчарашняга паседжаньня найважнейшым выпадкам было арыштаваньне яшчэ перад злажэньнем прысягі паслоў: Варшаўскага (кам.), Бачыньскага Ляв. (укр.), Сахацкага (кам.) Гаврона, Жука, Жубрыцкага (ўкр.) і Смалы (Вызваленьне). Паліцыя ўвайшла ў салю Сойму на чале з міністрам унутраных спраў і павяла паслоў у камісарыят ураду, дзе іх пратрымалі паўтары гадзіны... Гэты факт вырашыў кандыдатуру п. Бартэля на старшыню Сойму: немцы, украінцы, жыды пастанавілі галасаваць за пасла Дашыньскага.

Паслы Хадэцыі і Пяста ўстрымаліся ад галасаваньня.

„Дзен. Віл." даведаўся з Варшавы, што паслы „Х.-Д." і „Пяста" кінулі белыя (пустыя) карткі ў часе галасаваньня кандыдатаў на старшыню Сойму.

Сярод паслоў „Адзінкі"—сум.

У „Дзен. Віл." пішуць з Варшавы, што рэзультаты першага паседжаньня Сойму — выбар п. Дашыньскага старшынёй — зрабілі вялікі сум „Блёку Супрацаўніцтва з урадам". Але паслы „Адзінкі" быццам „пацяшаюць" сябе тым, што — Сойм будзе распушчаны... Але ж гэта немагчыма, бо ў бліжэйшым часе павінен быць разгледжаны бюджэт...

Адчыненьне Сэнату і выбары яго старшыні.

Такая ж цэрэмонія адчыненьня адбылася і ў Сэнаце. І там марш. Пілсудскі прачытаў ад імя Прэзыдэнта яго прамову. Але ў Сэнаце ўрадавы Блёк быў шчасьлівейшы: выбраны старшынёй Сэнату сэн. Шыманоўскі, — праф. Віленскага Унівэрсытэту, — з сьпіску Адзінкі. Сэн. Шыманоўскі атрымаў 54 гол., сэн. Познэр (ППС)—25, Сэн. Гломбіньскі (эндэк)—8.

Новавыбраны старшыня Сэнату сказаў кароценькую прывітальную прамову, у якой заявіў, што выбар яго, як сэнатара з „адзінкі" даводзіць жаданьне Сэнату супрацоўнічаць з урадам марш. Пілсудскага... — „Кабжа-ж гэта праца была карысна для бацькаўшчыны.—Хай жыве марш. Пілсудскі"...

Пасьля — выбраны віцэ-старшынямі Сэнату—сэнатары: Глівіц (урадав. блёк), Познэр (ППС) і Калушыньскі (ўкраінец). Першы раз яшчэ прадстаўнік тэрыторыяльных меншасьцяў выбраны ў прэзыдыум заканадаўч. палатаў.

Перад пачаткам польска-літоўскіх перагавораў у Кэнігсбэргу.—Польская дэлегацыя выяжджае.

29 сак. выяжджае ў Кэнігсбэрг польская дэлегацыя на перагаворы з Літвой, на чале з мін. Залескім. Мовамі перагавораў будуць польская і літоўская.

Літоўская прэса аб перагаворах.

Орган літоўскага ўраду „Літ. Рэха" ў апошніх артыкулах выражае сумліў, ці наагул магчыма такое частковае вырашэньне польска-літоўскае спрэчкі, якая будзе ізноў справавана ў Кэнігсбэргу,—бяз справы Віленшчыны. Газэта піша, што літоўская дэлегацыя мае паставіць на павестку перагавораў справу адшкадаваньняў за страты, зробленыя Літве „нападам ген. Жэлігоўскага". Напр. санітарныя ўстановы маюць патрэбаваць 350 тыс. літаў за лячэньне раненых.

Нямецкі ўрад прапануе сваё пасрэдніцтва ў перагаворах.

Газэты паведамілі, быццам нямецкі ўрад запрапанаваў Польшчы і Літве сваё пасрэдніцтва ў перагаворах.

Патрэбнасьць вучыцялёў.

Польскія газэты паведамляюць, што ў „паўпэхных" школах Сьлёнскага ваяводзтва ёсьць вольных 100 вучыцельскіх пасадаў, на якія шукаюцца вучыцялі. Паданьні да 30-га красавіка прыймае аддзел прасьветы Сьлёнскага ваяводзтва.

Цікава, што ў такой высока-культурнай частцы польскай дзяржавы забракла гэтак шмат культурных сілаў. А ў нас на „дзікіх крэсах" вучыцялёў поўныя школы, дый апрача школаў у каждай вёсцы ёсьць два-тры, а гдзе і болей беларускіх вучыцялёў і ня маючых школаў. Няўжо-ж гэта Польшча такая добрая для нас, што пакрыўдзіла на нашу карысь гэты Сьлёнск?

Але яшчэ лепшаю яна была-б, калі-б гэтыя пустуючыя сто пасадаў аддала нашым беларускім вучыцялям у нашай-жа Беларусі і ў школах у беларускай мове, а гэтых сто палякоў забрала туды.

Зноў усілаваньне забойства сьведкі ў справе „Грамады".

Пад такім загалоўкам польская „Gazeta Warszawska" зьмяшчае наступную заметку, узятую ёю з „Dz. Wil.", паводле якой, прыбыўшы на суд „Грамады" нейкі сьведка Сыронін, з мястэчка Дзенцёл, зьеўшы булку, купленую ў аднэй з пякарняў, дазнаў абяваў атруцьця. Пакліканы доктар лякарскага пагатовя устанавіў моцнае затруцьцё стрыхнінай, пэўная порцыя якое знаходзілася ў булцы. Сыронін адвезены ў шпіталь у цяжкім стане. Паліцыя вядзе энэргічнае сьледзтва

Цікава, надта цікава, што ў польскага страху такія страшэнна вялікія вочы!..

Упадак запасу валютаў і дэвізаў Польскага Банку.

Як падае ўрадавая статыстыка, запас валютаў і дэвізаў у Польскім Банку быў такі: 1-га студзеня г. г. 687.545 тысячаў зл., 1-га сакавіка г. г.—645.853 тыс. зл., а 20-га г. м. 634.900 тыс. зл. Як бачым, за два папярэднія месяцы (студзень і люты), спадак выносіць 41.692 тыс. зл., а за 20 дзён гэтага месяца 10 мільёнаў 953 тыс. зл., разам 52 мільёны 645 тыс. злотых.

Як бачым, дык зьдзейсьніваецца перадвыбарнае абяцаньне Бэзпартыйнага Блёку супрацоўніцтва з урадам працоўным гушчам нашага народу, што ён усё направіць — направіць, але чыёю шкураю, пэўна-ж ня ўласнаю і не абшарніцкаю, але шкураю гэтых-жа працоўных гушчаў.

Самасуд над зладзеямі.

У Варшаве з гары аднаго дому 2 злодзеі ўкралі бялізну. Калі яны сходзілі са сходаў, іх заўважыў адзін жылец гэтага дому і нарабіў гвалту. На трывогу зьбеглася некалькі чалавек, якія пабілі зладзеяў. Паліцыя паклікала доктара, які аказаў ім першую лякарскую помач.

Тарас Гушча.

Дзядзькаў сьведка

(З МІНУЛАГА)

I.

Ухадзіўся з работаю дзядзька Марцін. Яшчэ на тым тыдні скончыў сеяць грэчку. Патраіў і папар пад жыта. А да касьбы яшчэ астаецца тыдні са два. Здаецца, можна было-б і адпачыць трохі цяпер. Але адпачынкі ня ў дзядзькавай натуры: цяпер якраз і аб зіме час паклапаціцца, дроў падгатаваць трэба. Няхай сабе падсыхаюць за лета.

Узяў дзядзька Марцін грошы, пайшоў у лясьніцтва і купіў асыгнату на сажань дроў. А назаўтра з раніцы засунуў за пояс спрытную сякерку, узяў разак, прыстасаваны такім парадкам, каб можна было ім аднаму пілаваць, і пайшоў у лес.

У лесе многа дроў, а вось як пачнеш меркаваць, то не такая ўжо простая рэч паставіць сажань дроў, як гэта можа паказацца адразу. Трэба паставіць дровы так, каб і вывозіць іх з лесу было лёгка, каб і пад'ехаць да іх латва было дый каб і зьбіраць ня цяжка было. І калі пачнеш усё гэта браць пад увагу, то трэба такі парадкам патупаць па лесе, каб добрае месца натрапіць. Але дзядзька Марцін ведаў лес добра, у лесе гадаваўся, быдла пасьвіў, грыбы зьбіраў... Ды ці мала чаго бывала яму ў лесе здаралася. Яшчэ ідучы ў лесе, намеціў сабе мясьціну дзядзька Марцін, дзе дроў было многа, хоць трохі і далекавата.

За два дні работы нарэзаў, назьбіраў дзядзька цэлую кучу дроў, а на трэці дзень пайшоў у сажань складваць. І месца добрае выбраў, грудок сухі. А каб ад зямлі не надцягала сырасьці, то падлажыў дзьве жэрдалінкі. Адзін бок сажню прыпёр да хвоі. Адмерыў сажань ад хвоі і пачаў бярвенца ў зямлю забіваць, каб апора была дровам з другога боку. І так гладка работа пайшла—ну, проста ахвота брала дзядзьку Марціна. Складаючы дровы, дзядзька Марцін думаў вось аб чым. Калі ён браў у лясьніцтве асыгнату на гэтыя дровы, то сустрэўся там з аб'езчыкам Барбутовічам.

— Што, дровы стаўляць будзеш, Марцін?—пацікавіўся Барбутовіч.

— А так,—кажа дзядзька Марцін,—трэба-то паставіць.

— Уш гу!—буркнуў Барбутовіч.

Дзядзька Марцін ведаў, што Барбутовіч дагаварваўся, каб дзядзька зрабіў яму фундацыю.

Да дзе ж ты набярэшся на ўсякага лысага чорта? Дый з якой рацыі?

Але цяпер успомніў дзядзька гэтае спатканьне і тую размову. Чапляцца будзе, гад, каб прыдрацца да чаго. Вось чаму дзядзька пільна сачыў, каб ніводнага палена не знайшлося такога, што-б не падышло пад меру або перабрала гэтую меру. Злажыў дзядзька сажань акуратненькі, бо ня любіў рабіць абыяк. Калі і людзі не пабачаць яго, то самому ж паглядзець добра на сваю акуратную работу.

— Не,—сказаў сам сабе дзядзька Марцін:—не падкапаешся, брат! І яшчэ раз зірнуў на дровы. Хацеў ужо дадому йсьці. Аж глядзіць—Барбутовіч з лесу выходзіць. Падышоў і давай тыя дровыя аглядаць. Да кожнага палена прыглядаўся — ды так прыглядаўся, як-бы сярод іх знаходзіўся сваяк або яго добры прыяцель. Сьмех браў дзядзьку Марціна, як Барбутковіч аглядаў тыя дровы.

— А гэта што?!—сярдзіта спытаў Барбутовіч і ткнуў палкаю ў падпорку. А падпорка была дубовая. Знайшоў дзядзька Марціна гэтую разгаціну віламатую дубовую. На падпорку яна якраз і гадзілася.

— Падпорка,—адказвае дзядзька Марцін.

— Але ж гэта толькі вяршынка, а самы дубок дзе?

— А чорт яго бацьку ведае, дзе дубок. Гэта ўжо пану лепей ведаць, бо я лесу ня пільную.

— Ты ня пільнуеш, то я пільную. А за гэты дубок ты ў мяне паскачаш, галубок!— Так і сказаў, у тахту, складна сказаў. Дастаў з-за пазухі кніжку і пачаў запісваць.

А дзядзька Марцін, ужо сярдзіты, стаяў і казаў паціхоньку:

— Пішы сабе, пішы, няхай тваю шкуру чэрці сьпішуць.

На гэтым і разышліся.

Барбутовіч у лес пасунуўся, а дзядзька Марцін дадому пайшоў.

II.

Пачалося лета, а з ім і работа навалілася: касьба, а там і жніво. Дзядзька Марцін і думаць перастаў пра стычку з Барбутовічам. Сказаць па-праўдзе, ён і значэньня не прыдаваў гэтай стычцы—глупства: Барбутовіч проста застрашаў яго, каб дзядзька ня надта казырыўся перад ім і на згоду пайшоў. Карацей сказаць — Барбутовіч хацеў, каб дзядзька Марцін зафундаваў яму ўсё ж такі.

Урэшце дзядзька Марцін прышоў да думкі, што можа ён і паставіць Барбутовічу гэтую самую „фундацыю", бо мала што можа там здарыцца—бяз лесу ж чалавеку цяжка быць. Дык лепш ужо ў згодзе жыць, няхай іх пярун паб'е.

Мінулася лета, зноў вальнейшы час выдарыўся. Дзядзька Марцін каля дому тупаў. зьбіраўся жыта на насеньне ачысьціць кол з пяць, а цяпер ток глінаю падмазваў. Аж прыходзіць да яго староста Мацей Карнавух.

Паздароўкаліся.

— Тут, брат, ёсьць для цябе карталюшка адна, — сказаў староста і зьняў шапку: у шапцы насіў ён свае паперы.

Зьдзівіўся і спалохаўся дзядзька Марцін, бо тыя карталюшкі, што разносіць староста, нічога добрага ня скажуць табе. А тымчасам староста ўзяў адну такую карталюшку, доўга прыглядаўся да яе, а потым сказаў:

— Здаецца, што гэтая,—і падаў Марціну паперку. Дзядзька Марцін быў чалавек пісьменны. І рукі затрасьліся ў яго, калі ён вычытаў: „Павестка".

А як далей стаў чытаць, то вычытаў што земскі начальнік пазывае на суд за парубку дубка. На дваццаць чацьвёртае верасьня суд назначан.

Ссунуў дзядзька Марцін шапку на лоб, патыліцу пачухаў, а потым у вочы старасьце зірнуў і з вялікім дакорам галавою патрос.

— А бадай на іх упадкі і паморак бог наслаў! Ці-ж ёсьць на сьвеце тая праўда, браце Мацей? Да які-ж гэта дуб? Да хто яго сек, каб тваю шкуру боль пасек! А бадай-жа ты ў вадзе стаяў і піць прасіў! А каб ты па гары хадзіў ды сонца ня бачыў! А каб вас халерыя павыдушвала! А каб ты выхвараў да выстагнаў, абармоціна ліхая!

Прыпыніў дзядзька свае красамоўства, вочы ўніз спусьціў.

Старасьце часу ня было слухаць усяго таго, што казаў дзядзька Марцін, а калі дзядзька Марцін хацеў расказаць, як справа была, то староста адышоўся ўжо досыць далёка. Узрушаны дзядзька Марцін вышаў на прыгумень, кісет дастаў і стаў папяросу вярцець. З вачэй яго сыпаліся іскры злосьці, а мыслі заварушылі ся шпарка-шпарка, і калі

Вось як! Дык ужо б'юць ня толькі палітычных, але й крыміналістаў. Толькі б'е не паліцыя, а абураная публіка, паліцыя ж прыводзіць доктара. Каб да палітычных, то пэўна не прыззяла-бы.

Вучні—бандыты.

Ад пэўнага часу па акраінах Львова гайсала якаясь шайка, якая нападала на купцоў. Цяпер-жа паліцыя арыштавала праступнікаў, якія аказаліся вучнямі VIII клясы гімназіі, яны былі азброеныя. Цікава, чаму гэтых бандытаў не залічылі да „Грамады“. Мусіць таму, што там Львоў, у якім няма нічога беларускага.

Статыстыка самазабойстваў у Варшаве.

Статыстычны аддзел мястовай рады апублікаваў статыстычныя даныя аб самазабойвах у Варшаве за 1927 год. Усяго самазабойстваў у гэтым (1927) годзе было 1589. Мужчынаў, пасягаўшых на сваё жыцьцё, было 707, жанчын 334. Сьмяротных рэзультатаў 363. Атручаньняў было 1161, павешаньняў—84, самазабойстваў стрэльбамі — 113, скокаў у Віслу — 22, скокаў з вакон — 100.

Найбольш небясьпечным векам для мужчын зьяўляецца век ад 20 — 25 гадоў, у жанчын ад 16 — 19.

Як бачым, гэта шмат маладых, у самым цьвеце жыцьця, людзей выракліся дабравольна свайго жыцьця ў залатой, багатай сталіцы Польшчы.

Пэўна-ж, не ад золата гэта і багацьця, а ад нэндзы і бяды, жыцьцё было для іх горай сьмерці.

Арыштаваньне камуністаў.

„Жэчпосполіта“ ў № 94 падае, што ў Чэнстахове паліцыя арыштавала 7 камуністычных дзеячаў з ППС Лявіцы і Незалежнай Сялянскай Партыі. Пры арыштаваных знойдзены грамадны „кампрамітуючы“ матэрыял.

Хай іх з гэтымі „камуністамі“, як за імі нігдзе не павернешся, гэтак іх многа, дый гэтак яны багатыя на розны „матэрыял“!

РЭХА ВАЙНЫ.

У часе скіданьня з грузавога аўтамабіля старага жалеза, у адным з магазынаў у Катавіцах нагла наступіў выбух. Акалечыла вельмі цяжка трох работнікаў. Аказалася, што ў старым жалезе былі кавалкі гарматных снарадаў.

Каб гэтае няшчасьце здарылася ў нашай Беларусі, дык ужо шукалі-бы з яго вялікага беларускага паўстаньня, а як ў Польшчы, дык гэта толькі няшчасны выпадак.

Польскія радоўцы „будуюць“ панства.

Падаюць польскія газэты (Głos Prawdy, Kur. Wil.), што на гэтых днях было шмат надужыцьцяў пакражаў, зробленых польскімі урадоўцамі, а іменна: начальнік і віцэ-начальнік Лідзкай турмы абкралі турэмную касу, што першы быў прымушаны застрэліцца, а другі пасаджаны ў Лукішскую турму.

Другі выпадак—Прызыдыюм магістрату м. Лодзі пракраўся. Як падае „Głos Prawdy“, што надужыцьце-пакража было вельмі вялікае. Завядомлена аб гэтым пракуратуру і шукаюць віноўнікаў.

Трэці выпадак. Як падае „Kur. Wil.“, што каляёвы касяр у Нова-Сьвянцянах абакраў касу і згінуў у няведамым кірунку. Паліцыя ў пагоні. Як відаць з усяго вышэй пададзенага, што ўзноў пачалося „маральнае“ адраджэньне маладога польскага панства.

Заграніцай.

Да паразуменьня паміж СССР і Японіяй.

Камісія, зложаная з інжынэраў японскіх і радавых мае ў сярэдзіне красавіка распачаць шырокія дасьледчыя працы ўдоўж ракі Амура (на далекім Усходзе), шукаючы на радавай тэрыторыі накладаў золата, серабра, медзі, вугальля, газы і д. п. У памысным разе мае быць створана мяшанае таварыства радава-японскае дзеля выкарыстаньня накладаў. Гэта разглядаецца, як адна з праяваў пачаўшагася эканамічнага супрацаўніцтва між СССР і Японіяй—у выніку паразуменьня (асягнутага) ў Маскве японскай дэлегацыяй з міністрам Гото на чале.

У справе японска-радавых адносінаў.

„Праўда“ запярэчвае паданую загранічнай прэсай вестку, быццам па трэбаваньню японскага ўраду мае быць адклікаңы радавы пасол у Токіо Траяноўскі. Газэта сцьвярджае, што між Японіяй і СССР адносін. найлепшыя.

Перагаворы між СССР і Чэха-Славакіяй.

„Прагэр Прэссэ“ даведалася, што Літвінаў атрымаў ад радавага ўраду загад — падрыхтаваць перагляд існуючага трактату радава-чэха-славацкага з 1923 г., які ўжо значна ўстарэў. У часе перагавораў павінен быць разгледжана і справа юрыдычнага прызнаньня Чэха-Славакіяй радавага ўраду. У гэтай справе Літвінаў ужо канфэраваў у Жэнэве з мін. Бэнэшам—з памысным рэзультатам: у бліжэйшым часе перагаворы распачнуцца ў Празе.

Гандаль між Польшчай і СССР.

(Справазд. Гандл. Палаты Польшчы і СССР).

15/III адбылося вельмі лічнае агульнае сабраньне польска-радавай гандлёвай палаты, на якім прачытана была справаздача за мінулы год. З справаздачы відаць, што ўсяго Палата мела 164 сяброў. Выканаўчы Камітэт Палаты падзяліў працу Палаты на тры камісіі: эканамічную, выдавецка-рэфэратавую і праўна-парадную. Палата паміж іншым выдала ў расейскай мове брашуру аб Народнай гаспадарцы ў Польшчы — дзеля пашырэньня яе ў СССР.

Узаемны гандлёвы абарот між С.С.Р.Р. і Польшчай расьце, праўда павольна, але бясспынна. Так, у 1923 — 1924 г. агульны абарот між СССР і Польшчай дайшоў да 2.100 000 даляраў; у 1924 — 1925 г. ужо — 7.470.000 дал.; у 1925 — 1926 г. абарот спаў да 5.400.000 дал.; у 1926 — 1927 г. дайшоў да 16.000.000 дал.

Афганскі кароль паедзе ў Маскву.

Рыжская прэса падае, што—у Ленінград прыбыў паўнамоцнік афганскага караля Амануллы, які заявіў, што кароль мае прыехаць у СССР у канцы красавіка, — на тры тыдні. Як ведама, кароль Аманулла сядзіць цяпер у Англіі, дзе каля яго страшэнна круціцца англійскі ўрад, з усіх сілаў стараючыся адрадзіць яму візыту ў СССР. Праездам у СССР кароль, як даведалася польская прэса, мае пабыць нейкі час і ў Польшчы.

Нячуваны выпадак „афіцэрскага бунту“ ў англійскім флёце.

У апошнія дні вялікую сэнсацыю выклікала ў Лёндане вестка аб тым, што на адным з браняносцаў англійскага сярэдземнамарскога флёту афіцэрская каманда адмовілася выйсьці ў мора—пад сьцягам адмірала-камандзіра флёту.

Марскі міністар Англіі зараз-жа загадаў—экстрэнна разглядзець выпадак. Выклікаў адмірала ў Лёндан і аддаў справу на вырашэньне ваеннага суда.

Вялікая прадвыбарная прамова Пуанкарэ.

Пуанкарэ сказаў вялікую прадвыбарную прамову ў м. Бордо, у якой вельмі заклікаў выбаршчыкаў галасаваць за тых кандыдатаў, якія падтрымліваюць „нацыянальнае адзінства“ ў Сойме. Бо-ж гэтае „нацыянальнае адзінства“ дало ўраду магчымасьць зрабіць вялізарную працу аздараўленьня дый умацаваньня фінансаў і гаспадаркі краю. Вельмі асьцярожна і спрытна Пуанкарэ не вінаваціў у пераможаным фінансавым крызісе, амаль не давёўшым Францыю да банкруцтва, меўшую ўладу радыкальнае лявіцы, але вінаваціў—Немцаў, якія адмовіліся плаціць адшкадаваньні. Гэтым спосабам Пуанкарэ не адкідае, але гуртуе да еднасьці гэтую лявіцу. Каб яшчэ больш здабыць галасы лявіцы для ўрадавай праграмы „нацыянальнага адзінства“, Пуанкарэ заявіў, што—„пакуль ён будзе на чале ўраду, ён не дазволіць, каб наступ краю адбываўся шляхом зачыненьня вуснаў народнага прадстаўніцтва або — душэньня палітычных вольнасьцяў народу“...

Цікаўны працэс у Парыжу.

Вялікую сэнсацыю выклікаў тут рыхтаваны працэс паміж маршалам Фошам і камуніст. паслом Марті. Марш. Фош цягне ў суд пасла-камуніста за тое, што той публічна закідаў яму, быццам Фош запрапанаваў Канфэрэнцыі паслоў Антанты, каб паставілі яго на чале Міжнароднай Арміі (Саюзьнікаў)—дзеля таго, каб прагнаць з Расеі Радавы Урад. Быццам Фош абяцаў—як відзіць, узяць Маскву і зваліць камуністычны лад. Марш. Фош запярэчвае праўдзівасьць гэтага цьверджаньня. Галоўным сьведкам у справе мае быць камун. пасол Кашэн, які сядзіць у турме.

Магчымае паразуменьне Францыі і Італіі.

Лёндаьскія палітычныя колы з задаваленьнем сачаць за перагаворамі між францускім і італьянскім урадамі, якія быццам маюць кончыцца навет цесным саюзам. Гэткі памысны рэзультат перагавораў — ўрэшце—можа прычыніцца і да разьвязаньня канфлікту між Югаславіяй і Італіяй.

Перарыў польска-нямецкіх перагавораў.

„Бэрлін Кур'ер“ зьмяшчае агляд ходу польска-нямецкіх перагавораў у справе заключэньня гаспадарчага трактату. Тлумачучы афіцыяльны камунікат нямецкага тэлеграфн. агенства Вольфа, успомненая газэта піша, што новыя польскія распараджэньні ў справе падвышкі мытаў і ў справе правоў чужаземцаў (немцаў) на пагранічных тэрыторыях зрабілі для Нямеччыны вельмі цяжкімі нармальнае прадаўжэньне перагавораў з Польшчай. Газэта выказывае перакананьне, што ў кожным разе нямецкая дэлегацыя пакуль-што не паедзе зноў у Варшаву для прадаўжэньня перагавораў. Хаця — паводле газэты—вінаваты ў стварыўшымся палажэньні польскі ўрад, але нямецкі ўрад у сучасны мамэнт яшчэ ня можа прыняць канчальнай пастановы—аб спыненьні перагавораў. Справу павінна разглядзець нанова міністэрства заграічных спраў.

„Франкф. Газэта“ таксама лічыць цяжкім прадаўжэньне перагавораў, але разрыў іх цалком быў-бы рызыкоўным для абедзьвюх старон.

Іншыя газэты пішуць, што ўсю справу трэба адлажыць да новага Сойму.

Сялянскія хваляваньні ў Нямеччыне.

З Брэслаўля паведамляюць аб сутычках між сялянамі і паліцыяй у вокрузе Німч. Сутычка выклікана была адмовай сялян дапусьціць каморнікаў да прадажы з таргоў („ліцытацыі“) маемасьцяў—за няплату падаткаў. К часу і к месцу аукцыёну (ліцытацыі) сабраліся да паўтары тысячы сялян, якія пастанавілі не дапусьціць да прадажы. Тады выклікана была паліцыя.

Аўкцыён пачалі, але не зьявілася ані воднага купца на сялянскую маемасьць. Сяляне-дэманстранты скінулі паліцэйскі грузавік у канаву і г. д. Паліцыя пачала працаваць „рэзінай“, але пасьля былі выкліканы падсілкі ужо з кулямётамі. Натоўп сялянскі пачаў хвалявацца гарачэй. Тады афіцэр кулямётнай каманды аддаў загад падрыхтаваць кулямёты „да баявой гатоўнасьці“. Аднак-жа ён не хацеў браць на сябе адказнасьць, дык зьвярнуўся да вышэйшых уладаў у Брэслаўлі. Тыя-ж загадалі — ні ў якім выпадку не дапускаць да праліцьця крыві. Скончылася на тым, што „ліцытацыя“ была спынена.

Тайныя збраеньні ірляндзкіх незалежнікаў.

У рэзультаце досьледаў англійская паліцыя выкрыла шэраг тайных складаў аружжа і амуніцыі, належачых да сяброў ірляндзкай рэспубліканскай арміі ў Лёндане. Адна асоба арыштавана, але спадзяюцца далейшых арыштаў. Большасьць знойдзеных рэвальвэраў гішпанскай маркі.

Фашыстаўская рэформа дзяржаўнага ладу ў Літве.

Афіцыяльная прэса зьмяшчае цікаўны артыкул аб урадавым праекце — стварэньня „Дзяржаўнай Рады“, якая мела б замяніць зусім скасаваны парлямант у Літве. У гэтую Раду павінны былі ўвайсьці ў значнай большасьці сяляне — бо сялянства — вялізарная большасьць насяленьня краю.

Але сяляне гэтыя павінны быць толькі ў старэйшым веку (і „благанадзежныя“, і „правомысьлныя“, дадае ад сябе „Усходн. Аг.“) Выбары маюць быць двух-ступенёвыя: сьпярша гміны выбіраюць выбаршчыкаў у павятовы зьезд, ці камітэт, які ўжо выбірае з пасярод сябе „пасла“. Ведама-ж так — пэўней. Частку „паслоў“ маюць выбіраць і месты.

* * *

Пасьвячаю сваім школьным сябрам.

Веснавістыя шляхоў'і,
Сонца, неба, як крышталь...
Кіньма клопат аб штодзёў'і,
Пойдзем, хлопцы, ў даль...
Шлях даўгі лечыць зьнямогу,
З сонцам братаючы нас...
Гэй! здароў, шляхі, дарогі,
Дальны агняпас!..

1928 г.

* * *

Пад сонцам гараць, палымнеюць
Вясеньнія песьні зямлі...
Паглянь! Чалавецтва надзеі—
Усходзяць прыгожыя дні.
Па далі далін, над палямі,
У нетрах радзімых палёў—
Яны усьміхаюцца з намі,
Разьвейваюць жудаснасьць сноў.

1928 г.

* * *

Ужо вясна, хоць мо' й марозы
Ня раз захочуць панаваць...
Але дарэмны іх пагрозы —
Вясной сьмяецца неба гладзь...
Ужо лятуць, напэўна, птушкі,
Да нас кіруючы свой пуць,
А на палёх—зямлі вяснушкі
Пад сонцам сохнуць і цьвітуць...
І штось гавора мне, што скора
Жыцьцё пад сонцам зацьвіце...
І згіне крыўда, згіне гора
У нашай беднай старане.

1928 г.

дзядзька Марцін выпусьціў першы клубок дыму, то ў яго ўжо быў гатовы праект абароны на судзе. А калі абурэньне ўлеглося, то дзядзька Марцін стаў больш спакойна абмяркоўваць гэты праект. Тое, што радзілася ў мінуту злосьці, у стане спакойнага разважаньня, пачало разьвівацца, вырысоўвацца болей яскрава і пуката.

Гэты праект захапіў дзядзьку Марціна сваёю простасьцю і ў той-жа час непераможнаю сілаю свайго доваду. Так ён і зробіць. І цікава будзе паглядзець, куды дзене свае вочы гэты кусок басяка, Барбутовіч, калі дзядзька Марцін зробіць на судзе тое, што ён цяпер замысьліў?

Дзядзька Марцін высока падняў галаву, згарнуў кулак, грозна падпёр ім адну ноздру, а ў другую так смаркнуў, што і пыл і ўсё тое, што было ў палавіне носа, разьляцелася малюпасенечкімі пырскамі, а вераб'і ад страху шуганулі ў паветра і толькі на стрэсе Сальвэсевай клуні да памяці прышлі.

— Паглядзім, хто каго ў лапці абуе,— прамовіў дзядзька Марцін на прыгуменьні.

Назаўтра-ж пайшоў дзядзька Марцін у лес пад той сажань. Стаіць сабе ў лесе — й горачка мала. Але ўся ўвага дзядзькі Марціна спынілася на дубовай падпорцы, на тэй падпорцы, што і дала пачатак усей гэтай квэстыі. І каб людзкае што: паршывенькі раскарака, пазіраць няма навошта. І тут патрос галавою дзядзька Марцін і сказаў:

— І за такую брыду ў суд цягнуць!

Прынёс дзядзька другую падпорку, а гэтага раскараку з зямлі дастаў, яшчэ раз зірнуў на яго, а потым закінуў яго на плячо — і вагі ў ім было ня больш, як фунтаў пятнаццаць—і панёс дамоў. А калі сустрэўся яму Сьцёпка Зажмура і спытаў, што гэта нясе дзядзька Марцін, то дзядзька Марцін сказаў важна і сур'ёзна:

— Гэта, брат, сьведка мой!

III.

Кожны сьведка звычайна карыстаецца пэўнаю павагаю ў тых, каму ён сьведчыць зьбіраецца. І слова добрае скажуць яму, і горкаю пачастуюць. І дзядзькаў сьведка таксама ў пашане быў.

Папершае, дзядзька Марцін нёс яго на сваіх плячох вёрст пяць з лесу, а падругое, прынёсшы дамоў, адвёў яму месца ў клуні— і добрае месца: адзін канец пад стрэху падправіў, а другі над жытам зьвісаў, дзе і суха было і падыхаў чысты ветрык. На вольным ветрыку ён падсыхаў і рабіўся яшчэ больш мізэрны. Для чалавека гэта было-б ня добра, а дубоваму чурбаку гэта найлепшая павага. Ня было таго дня, каб дзядзька не падумаў пра свайго сьведку, а прыдзе ў клуню, то першым дзелам на яго зірне, як ён маецца там, над страхою.

Адным словам, гэты дубовы чурбанок з часам набываў у вачох дзядзькі Марціна значэньне пэўнай асобы: гэта ня толькі яго сьведка, але навет і адвакат. Дзядзьку часамі прыходзіла ў галаву думка ачасаць крыху свайго сьведку сякеркаю, каб ён меў трохі больш шляхетны выгляд, бо яму-ж прыдзецца стаяць перад вачамі земскага начальніка, але ачасаць яго ўсё ж не адважыўся: у яго ўласным адзеньні і выглядзе больш натуральнасьці, больш праўды, больш адпаведнасьці самому факту.

У суботу 24 верасьня, раненька, увайшоў дзядзька Марцін у клуню, палез на жыта і выцягнуў з-пад страхі свайго сьведку.

— Пойдзем, брат, судзіцца!

Палажыў на плячо і пайшоў на суд.

Азірнуўся дзядзька Марцін—нікога ня відаць, загуменьнем на дарогу вышаў, уздыхнуў вальней і пайшоў. Да земскага начальніка трэба было вёрст 12 зрабіць. Незнаёмыя людзі, мінаючы дзядзьку Марціна, аглядаліся назад, а знаёмым ён казаў:

— На суд іду і свайго сьведку нясу.

Земскі начальнік жыў у мястэчку. У дзесяць гадзін раніцы дзядзька Марцін на месьце быў. Уваходзячы ў дом, дзе жыў земскі начальнік, дзе была яго судовая камэра, дзядзька Марцін зьняў з пляча свайго сьведку, узяў пад паху і памаленьку ў карыдор увайшоў. Спусьціў паціхеньку сьведку на падлогу, ня ведаючы, што з ім далей рабіць, дзе яго дзець. Каля дзьвярэй канцылярыі спыніўся, паставіў чурбак у куточку каля дзьвярэй і сам прыпыніўся там. А калі вышаў пісарчук і заўважыў дзядзьку Марціна з дубовым чурбаком, то вельмі зьдзівіўся і ня ведаў, што сказаць—спалох узяў, мусі быць. А дзядзька Марцін растлумачыў:

— Сёньня мой суд назначан, а гэта мой сьведка.

— Ага!—сказаў пісарчук і, відаць, зусім здаволіўся такім тлумачэньнем, а потым запытаў:

— А як твая фамілія?

— Марцін Ражка. Калі ласка, ці ня можна мне тут пастаяць, покі не паклічуць мяне?

— Стой сабе,—адказаў пісарчук і пайшоў у канцылярыю. Стаіць дзядзька Марцін каля дзьвярэй, прытрымліваючы свайго сьведку, каб ён не пакаціўся і грукату не нарабіў тут, а сам то вуха да замка прыложыць, то ў замочную дзірачку гляне. У другія дзьверы земскі начальнік увайшоў і адразу надзяе на сябе ланцужок з мэдальлю.

Штурхануў дзядзька Марцін локцем свайго сьведку і шапнуў яму:

— Трымайся, брат!

Гадзіны са дзьве прастаяў дзядзька Марцін каля дзьвярэй, прыкладаючы то вуха, то вока да замочнай дзірачкі.

— Марцін Ражка!—пачуў дзядзька Марцін і так перапалохаўся, што і сьведку выпусьціў.

— Я!—гукнуў дзядзька Марцін, колькі моцы было, а дзядзькаў сьведка—джа-джух аб падлогу! Як-бы там з гарматы выстралілі, аж земскі начальнік на крэсьле падскочыў.

Борзьдзенька падняў дзядзька Марцін свайго сьведку, шапку яшчэ раней у кішэню ўпхнуў, адчыняе дзьверы і з дубовым чурбаком у суд уваходзіць.

— А гэта што такое?—крыкнуў земскі начальнік.

— А гэта мой сьведка, ваша высокародзіе!—адказаў дзядзька Марцін.

— Тры рублі штрафу за паяўленьне ў судзе не ў належным відзе!—крыкнуў земскі начальнік,—і сем рублёў штрафу за парубку дубка,—дадаў ён.

— Ваша высокародзіе...

— Выносіся за дзьверы, мужлан, а не—пад арышт пасаджу!

Выбег дзядзька Марцін, як апараны. Крыўдна, горка і сорамна стала дзядзьку Марціну.

— Вось, брат, і насьведчыў ты мне! — сказаў ён свайму сьведку:—і дзе-ж падзець мне цябе?

Ішоў вуліцаю дзядзька Марцін, пагляддаў, куды-б яму сьведку закінуць. А потым шкада стала кідаць яго, і прышоў з ім дадому, палажыў пад страху: няхай ляжыць, можа ён яшчэ скажа слова свае.

Новы зварот у Румыніі.

Венскія газэты даносяць з Бухарэшту, што ў Румыніі падрыхтоўваецца новы зварот у ўнутраным палажэньні. Быццам урад абгаварывае ўжо магчымасьць выхаду ў адстаўку, адступіўшы ўладу апазіцыі. Паміж урадавай партыяй (ліберадаў) і апазіцыйнай „нацыянальна-сялянскай партыяй“ ідуць перагаворы толькі ў справе часу, калі мае адбыцца зьмена ўраду. Прэм. Братыяну жадае адзорчкі да 22 красавіка, калі ён кончыць усе праектаваныя фінансавыя меры. Але павадыр „сялянскай партыі“ пас. Маніў не згаджаецца на гэта, кажучы, што—да 22 красавіка павінна ўжо быць усе скончана—бо на гэты дзень назначаны Вялікі Усенародны Кангрэс Нацыянальнай Сялянскай Партыі ў Альба Джуліа.

Паводле іншых вестак — з Румыніі — прэм. наадварот мае рашучы намер—ня ўступаць уладу, але тасаваць да апазіцыі найвастрэйшыя спосабы барацьбы.

Ген. Кармона ізноў прэзыдэнтам Партугаліі.

Ген. Кармона, фактычны дыктатар Партугаліі, ізноў выбраны прэзыдэнтам Партугальскай Рэспублікі.

Наша хроніка.

Сьвятаваньне 10 угодкаў абвешчаньня незалежнасьці Беларусі. 25-га сакавіка беларускае грамадзянства сьвяткавала дзесятыя ўгодкі абвешчаньня незалежнасьці Беларусі. У салі Віл. Белар. Гімназіі адбыўся ціхі, без жадных прамоў, але урачысты, вечар. Саля была вельмі прыгожа прыбрана ў нацыянальныя колеры. На гімназіяльнай сцэне згуляна была п'еса Марцінкевіча „Пінская шляхта“, пасьля якой быў наладжаны вельмі багаты канцэртны аддзел. П'еса была згуляна вельмі добра, усе артысты выканалі свае ролі добра. Некаторыя з іх, як напрыклад гр. Міхалевіч, Замэцкі і Вучні выканалі свае ролі так, што былі жывы і праўдзіва прадстаўлялі тыпы п'есы. Адчувалася у некаторых слабое веданьне ролі, але выяўляліся яны з гэтага вельмі ўмела, ня шкодзячы ўражаньню ад п'есы.

Вельмі глыбокае і прыгожае ўражаньне зрабіў на прысутных канцэртны аддзел, які складаўся з сольных нумароў, выкананых грамадзянкамі Зубовіч і Шырмавай і з песьняў, выкананых хорам пад кіраўніцтвам гр. Шырмы.

Праз увесь час вечара адчуваўся вельмі паважны настрой, што яшчэ больш падкрэсьліваў урачыстасьць дня 25 сакавіка.

Урачыстае пасяджэньне Беларускага Нацыянальнага Камітэту. Нацыянальны Камітэт сабраўся на Віленскай вуліцы 12 а 11 гадз. Урачыстае пасяджэньне адчыніў пасол Д-р Дварчанін, як віцэ старшыня Камітэту. На старшыню пасяджэньня былі выбраны самы старэйшы з грамадзян, прысутных на сходзе, інж. Няканда Трэпка. Прысутныя ў сваіх прамовах выказалі тую важнасьць, якую мае ў гісторыі Беларускага Народу 25 сакавіка 1918 г. Вуснамі сваіх прадстаўнікоў Беларускі Народ агаласіў усяму сьвету аб сваей найвялікшай волі, пасьля некалькіх стагодзьдзяў няволі, волі да незалежнага жыцьця.

Гэта быў як-бы першы этап у перыядзе адраджэньня да вольнага, незалежнага жыцьця. Але Беларускі Народ у сваей абсалютнай большасьці складаецца з працоўных мас. дык і воля гэта мае быць здзейсьнена згодна з інтарэсамі, жаданьнямі і патрэбамі гэтых мас. Мала аднаго слова вольнасьць, незалежнасьць, трэба яшчэ ў гэтыя словы ўліць пэўны зьмест, адпавядаючы як-раз большасьці Беларускага Народу.

Багаслужбы. У зьвязку з дзесятымі ўгодкамі абвешчаньня незалежнасьці Беларусі адбыліся багаслужбы: для каталікоў у касьцёле сьв. Мікалая, для праваслаўных у Троіцкай царкве і для мятадыстаў у капліцы мятадыстаў на Троіцкай вуліцы.

Звальненьне з вастрогу пасла Ал. Стагановіча. „Кур Віл.“ паведамляе, што пасол Ал. Стагановіч, выбраны ў Наваградзкай акрузе па сьпіску № 39—„Змаганьне за інтарэсы сялян і работнікаў“—выпушчаны з вастрогу.

Забастоўка краўцоў скончылася. Баставаўшыя краўцы, сябры хрысьціянскага прафэсыянальнага саюзу, прыступілі да працы.

Забастоўка скончылася перамогай рабочых, бо яны дабіліся задаваленьня сваіх дамаганьняў.

Прафэсыянальнае жыцьцё. У м. Ашмянах арганізаваўся прафэсыянальны саюз хрысьціянскай дамовай прыслугі.

„Студэнцкая думка“. Выйшаў з друку № 2 (9) „Студэнцкай думкі“ за месяц сакавік — красавік. Рэцэнзію аб ёй падамо ў наступным нумары газэты.

Ахвяры. В. Сялюкі, Жыдамлянскай воласьці, Гарадзенскага павету ахвяравала на карысьць пацярпеўшых ад стыхійных бур 42 зл. 30 грошаў.

Падзяка. За дзьве манэты, ахвяраваныя ў беларускі музэй ім. Ів. Луцкевіча, урад Беларускага Навуковага Т-ва прыносіць ахвярадаўцы — Сурвіле Язэпу з в. Вялевічы, Смаргонскай гміны, Ашмянскага павету — шчырую падзяку.

Сьвяткаваньне ў сельсаюзьнікаў і хадэкаў. Сельсаюзьнікі і хадэкі, апрача малебня ў касьцёле і царкве, выразілі пашану да сьвяткаваньня 10-х угодкаў абвешчаньня незалежнасьці Беларусі яшчэ акадэміяй у Інстытуце Гаспадаркі. і Культуры. Ясна, што і цяпер у іх не абышлося без банкету з выпіўкай. Бо і як-жа не ўшанаваць ім такое сьвята выпіўкай?

Арышты „камуністаў“. Як падае польскае „Słowo“, — № 71 26 г. месяца ўладамі бясьпечнасьці зьлікведавана „камуністычная дывэрсыйная арганізацыя“, працуючая ў паразуменьні з суседняй дзяржавай, на тэрыторыі Уладзімірскага павету, арыштавана 22 асобы.

Забойства польскага вучня. Як падае „Kur. Wil.“, на гэтых днях застрэліўся вучань 7 кл. Сувальскае Гімназіі Тодар Болендаь у самым-жа гмаху гімназіяльным. Як відаць, таксама добрае „адраджэньне“ і арганізаванасьць вучняў, што нават у Гім. з карабіна страляюцца, гэта ўжо ня першы выпадак. А калі ў беларускіх Гім. з'арганізавалася дружына скаўтаў з палкамі, то польская прэса крычала, што гэта „камуністычныя баёўкі“, якія як быццам маюць нападаць на „szanownych panów“.

Новы павет у Навагрудзкім ваяводзтве. Навагрудзкае ваяводзтва апрацавала праект аб падзеле Лідзкага павету на 2 староствы.

На Лідзкае стараства, з сядзібай у Лідзе і Шчучынскае, з сядзібай у Шчучыне. Гэты праект увойдзе ў жыцьцё па зацьверджаньні яго Міністрам Унутраных Спраў.

Асьвятленьне гарадзкіх садоў.

Віленскі магістрат пастанавіў устанавіць у гарадзкіх садах 60 новых электрычных фанароў. Апрача гэтага, заказана больш 90 новых лавак, і папраўляюцца старыя.

Надта добры надарунак Магістрату, толькі ня тым, хто і ў сьвята працуе, а тым, каму і ў будні сьвята.

Будова дамоў для ахвіцэраў.

У канцы красавіка пачнецца ў Вільні будова дамоў для ахвіцэраў і пад'ахвіцэраў.

Як ведама, як ахвіцэры, так і пад'ахвіцэры, атрымліваюць жалаваньне, на якім можна жыць без бяды, калі не ў галаве, то хоць у руках.

А калі-ж гэта будуць будаваць хаты для тых нашых сялянаў, якія яшчэ жывуць у зямлянках, ня толькі, што нічога ня атрымліваючы, а яшчэ аддаючы на падаткі астатні грош.

Чыстата ў Віленскіх пачатковых школах.

Санітарна-мэдыцынскі пэрсонал заўважыў у гэтым месяцы ў 36 гарадзкіх пачатковых школах—109 дзяцей хворых на экзэму, 300 маюць прыметы сухотаў, 1351 брудных і 357 вашывых.

Калі лік апошніх параўняем з лікам вашывых дзяцей мінуўшага году, дык убачым, што цяпер лік іх дужа зьменшыўся. У студзені, — сакавіку — мінулага году вашывых дзяцей было 1400—1357.

Ня гледзячы на тое, што за гэты час вашывасьць значна зьменшылася, усё-ж такі шмат паразітаў п'е кроў нашага брата.

Фільмовая школа ў Вільні.

Саюз Артыстаў Кінэматаграфічнай штукі закладае ў Вільні фільмовую школу. Вось добра, але ня нам! Уже цяпер Вільня будзе зусім панскаю!..

З жыцьця Беластока.

Праявы беларускага грамадзкага жыцьця, знайшоўшыя жывы водгук сярод працоўных гушчаў, выказалі поўнасьцю імкненьні нашага народу. Працоўныя гораду і вёскі зразумелі, што адной з найважнейшых зьлыбедаў, зьлажыўшыхся на іх нядолю, ёсьць цемра. Жаданьне змагацца з ёю і находзячае адсюль жаданьне асьветы выказалася, між іншым, у масавым уступленьні работнікаў і сялян у Таварыства Бел. Школы. Сотні гурткоў, пакрыўшых нашую старонку, сталіся крыніцаю (роднае школы няма) асьветы, далі магчымасьць выказаць жыцьцятворчую сілу нашага народу. Шмат здольных і ахвочых да культурнае працы людзей, атрымалі магчымасьць выказаць сябе на культурным шляху—шляху да лепшае будучыні. Частыя заметкі аб жыцьці Т-ва Бел. Школы на мясцох, зьмяшчаныя на шпальтах беларускае прэсы, сьведчаць аб надзвычайнай працы гэтае арганізацыі. У сваёй заметцы хачу крыху спыніцца над працай гуртка Т-ва Бел. Школы ў горадзе Беластоку. Супольныя і ахвярныя высілкі беластоцкіх рабачаяў—сябраў гуртка, скіраваліся насамперш да прыдбаньня Т-ву, больш-менш адказуючага яго мэце, памешканьня. Уласнае памешканьне дало неспадзяваныя вынікі. Работніцкая ахвочая да культурнае працы моладзь ахвотна йдзе ў родную арганізацыю. На працягу кароткага, бо 3-х месячнага, часу гурток здабыўся на бібліятэку, складаючуюся з 600 экзэмпляраў кніг, пераважна ў белар. мове. Адначасна з бібліятэкай паўсталі музычная і драматычная сэкцыя. Апошняя захвочаная нязвычайным пасьпехам трупы віленскага мастака гр. Міхалевіча, ставіўшага 14 і 15 студзеня г. г. ў Беластоку два спэктаклі, запрасіла да рэжысэрні мастака Аядрэйчка і з яго помачай наставіла ў лютым і сакавіку г. году 3 спэктаклі. Апошні спэктакль быў пастаўлены 18 гэт. месяца. Ставілі п'есу Галубка „Суд“ і жарт Чэхава „Мядзьведзь“. Гульня артыстаў, з пасярод якіх трэба адзначыць грамадзян: Кавальчыка—Міроя; Герасімчыка — Авечка і Андрэйчыка—Куніцкі, сьведчыла аб вялікай упраўнасьці маладое трупы. Гром апплёдысмэнтаў, шчырыя словы падзякі, выклікаць артыстаў былі доказам, што артысты дапялі сваей мэты.

Чэсьць, Вам маладыя сейбіты роднага слова, шчыра жадаю пасьпеху ў далейшай працы. Будзьце прыкладам для іншых.

Старэйшы.

З Т-ва Бел. Школы.

Праца гурткоў.

✕ (в. Шылавічы, Слонімскага павету). Шылавіцкім Гуртком Т-ва Белар. Школы ў час Каладных сьвят былі наладжаны цэлы рад вечарынаў-спэктакляў, а іменна: На першы дзень Каляд былі адыграны наступныя п'есы: „Страхі жыцьця“ і „Лекары і лекі“; на другі дзень—„Сурдут і сярмяга“, на Новы Год—„Апошняе спатканьне“ і „Боты“. Усе вышэй ўспомненыя п'есы былі выкананы вельмі добра нашымі маладымі аматарамі-артыстамі. Найбольш працы палажылі сябры драматычнае сэкцыі, за што вялікая падзяка ўсім учасьнікам.

Карэспандэнцыі.

Культура шырыцца.

(Вёска Касьцяні, Чамерскае вол., Слонімск. п)

9. I. 28 г. Гуртком Т-ва Белар. Школы ў в. Касьцянях быў наладжаны спэктакль-вечарына; адыгрываліся дзьве камэдыі: „Боты“ і „Мікітаў лапаць“. Ня гледзячы на тое, што ўсе аматары-артысты выступалі па першаму разу на сцэне, адыгралі свае ролі вельмі добра. Глядзельнікаў было гэтулькі, што немагчыма было зьмясьціць у памяшканьне, дзеля гэтага прышлося ставіць два разы. Я не магу прайсьці моўчкі, каб не прывітаць Касьцянеўскую моладзь за яе культурна-асьветную працу пасярод свайго сярмяжнага бяздольнага люду. Сэрца радуецца, калі моладзь нашай вёскі загаварыла аб асьвеце і ставіць сваей мэтай і далейшае змаганьне з цемраю. Гэтак, дарагія браты, даўно пара зразумець патрэбу змаганьня з цемраю, толькі гэткім шляхамі мы станем нароўні з тымі людзьмі, якія лічаць нас нікуды ня годнымі. Няхай кожнае зярно, пасеянае вамі, узыйдзе і дасьць добрыя плады ў будучыне. Няхай кожны з вас зразумее, што гэта вялікая творчая праца нарэшце скіне з плячоў вечнае ярмо цемры.— Але поруч з гэтым, хоць й больна мне выказываць такіх людзей, але мушу выпаўніць свой грамадзкі абавязак і вымяніць іх тут, а іменна: Кастусь сын Яўхіма Багданчук, Янка Грэцкі і Васіль Дабрыян, яны замест таго, каб ісьці поруч з усею моладзьдзю, дык напіваюцца гарэлкі, як гэта было на першы дзень Каляд, пасьля заводзяць бойкі, аднача́сна стараліся справакаваць спэктакль, які дадзіўся на трэці дзень Каляд, адгаварваючы дзяўчат, каб ня ішлі на спэктакль, а замест гэтага яны зробяць „ігрышча“ і паглядзяць бясплатна на іх, дурняў, як яны п'яныя будуць „адыгрываць свае“ ролі. Аднак, ім гэтага зрабіць не ўдалося, бо навет малыя дзеці сьмяяліся з іх, як з дурняў.

Ганьба вам! Вы гэткаю дарогаю далёка ня зойдзеце, прыглядзецеся да сваіх калегаў, з якімі разам жывеце, ці-ж яны да гэтага імкнуцца? Ці-ж вы хочаце, каб на вас кожны глядзеў з агідай? Ці Вам таксама хочацца перашкаджаць кул.-прасьв. працы? Калі не, дык кіньце сваю брудную працу, а прылучыцеся да радоў змагароў з цемраю.

Змагар.

Спэктакль-вечарына.

(Картуз-Бяроза).

19./II. 1928 г. артыстамі-аматарамі быў наладжаны спэктакль-вечарына ў м. Картуз-Бяроза. Ставілі п'есу „Апошняе спатканьне“ Ул. Галубка, і 26./II. быў таксама наладжаны спэктакль дзе згулялі: „Сурдут і Сярмяга“ — Гутоўскага. Абедзьве п'есы былі адыграны вельмі ўдала і пры вялікім натоўпе глядзельнікаў. Усе былі проста захоплены вечарынамі. Пытаньням ня было канца: калі йшчэ будзе спэктакль. Агульны збор быў ад 2-х спэктакляў 232 зл., з якіх 63 зл. асталася, як чыстага даходу; рэшта пайшла на памешканьне, духовы аркестр, грыміроўку, дэкарацыю і другія дробныя выдаткі.

З Радавае Беларусі.

„Антыпольская акцыя ў СССР“.

Польская газэта „Słowo“ ў № 61 падае наступнае: „У Менску арганізуюцца антыпольскія выступленьні.

Цэнтральны Камітэт Арганізацыі Міжнароднай Помачы Рэвалюцыянерам (МОПР) абвясьціў вынікі акцыі процi працэсу „Грамады“. Па гэтых даных, з Радавай Беларусі ўплыло каля 15 тысяч пратэстаў. Адначасна МОПР афіцыяльна нібы ўзяў на сябе апеку над сем'ямі арыштаваных грамадаўцаў (?!).

Адначасна з гэтым зьбіраюцца складкі на карысьць увязьненых сяброў „Грамады“. З работніцкіх заработкаў на фабрыках Радавай Беларусі затрымліваюцца пэўныя працэнты.

Старш. нядаўна ўтварыўшагася „Камітэту Абароны Грамады“ МОПР Янка Купала з двумя сябрамі гэтага-ж Камітэту адправіўся ў Кіеў, а потым у Харкаў, дзе адбудуцца даклады аб працэсе, а потым скліканы пратэстацыйныя вечы. Пасьля гэтага з Украіны Купала з сябрамі маюць ехаць у глыбіню Расеі.

Апрача ўсяго гэтага, выдана адозва на ўсіх эўрапейскіх мовах, кляймячая польскія ўрады за працэс „Грамады“. Адозва гэтая мае быць разаслана на кошт Радавай Беларусі, да ўсіх работніцкіх, партыйных, а таксама і культурных арганізацыяў усяго сьвету. У Міжнарод. Лігу Абар. Правоў Чалавека будзе пасланы спэцыяльны пратэст. У гэтым пратэсьце зьвяртаецца ўвага на „rzekomo“ нябывалы, пануючы цяпер тэрор у Польшчы. Апрача гэтага, мае быць выдана вялікая інфармацыйная брашура аб прасьледаваньнях у Польшчы.

Стараньнем „Камітэту Абароны Грамады“ адчынена спэцыяльная гаспадарчая і рэдакцыйная камісія, якая зайжецца справай даставаньня сродкаў на антыпольскую акцыю. Дзеля гэтай мэты мае быць арганізавана вялікая лётэрэя на абшарах Радавай Беларусі і Украіны!

Цікава, ці гэтыя весткі манархістычнага „Słowa“ адказваюць запраўднасьці!

Паштовая скрынка.

Селяніну. Ваша карэспандэнцыя ня можа быць зьмешчана, бо за яе цяпер могуць сканфіскаваць газэту.—**Суседу Войта, Я. Царпігораваму, Красвагорцу, Нецярплівому, А. Амельяновічу, Мішуцкаму, Шуцкаму, Мужыку, Хаценчаніну, Асташыку, Яніцы Няшчаснаму, Васілю Стрэлінікеваму, Спартаку, Г. Амельянчуку і М. Сялівончыку, Алесю Пяруну, Ворагу Несправядлівасьці, Касьцянеўскаму Змагару, Беззямельнаму, Солтысу Франуку, Лукшу, Рабочаму, Хв. Чарняўскаму, А. Хроміну, М. Радзюкевічу, Азярнічаніну, Беднаму, Унуку, Верхагиядаваму, Аднаму з нямногіх, А. Выдрыцкаму і Быстрыцкаму, Варанілаўцу і Маладому Молату,** шчыра дзякуем за перадвыбарчыя карэспандэнцыі, але нажаль іх выкарыстаць не маглі, пэўна Вам ведама па якіх прычынах. Пішыце аб цяперашнім жыцьці.

І. Вясёламу. Ваш вер не падыходзіць да друку, лепш пішыце карэспандэнцыі.

Л. Мінкевічу. Ужо ўсім вядома, што ксяндзы мяшаюцца ў палітычныя справы. Напішыце, якія Вам друкі патрэбны.

Яну Горскаму. Бел. Кнігарня грошы нам перадала ў суме 9 зл. 10 гр. За 1927 год належыцца яшчэ ад Вас 2 зл. 40 грошай.

Язэпу Паўрэпе. Вашага артыкулу зьмясьціць ня можам.

Усячына.

Жаночая паліцыя.

У Англіі, а перадусім у Швайцарыі, што раз, то больш гарадоў уводзяць у сябе жаночую паліцыю. Ужываецца яна і дае найбольш карысьці пры ахране цьвятнікоў, траўнікоў, кустоў і г. д. Дзеці слухаюць гэтую паліцыю лепей, як матак або апякунак.

Шэф паліцыі ў Нотцінгаме абвясьціў, што жаночая паліцыя дае больш карысьці, чым на яе расходуецца.

Рэдактар-Выдавец: Пілін Назарук.

Друкарня Я. Левіна, Вільня, Нямецкая 22.